# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі Ананькі К. Д.
«Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)»,
прадстаўленнай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Актуальнасць тэмы даследавання абумоўлена асаблівай увагай, якую сучасныя даследчыкі звяртаюць на вывучэнне нацыянальных працэсаў і станаўлення беларускай дзяржаўнасці ў XX ст. У гэтым кантэксце барацьба за беларускія школы на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі стала важным фактарам ў захаванні нацыянальнай культуры. У той жа час праблема дзейнасці беларускіх гімназій не была прадстаўлена ў асобным комплексным дасладаванні, а толькі часткова прадстаўлена ў працах, прысвечаных асобным пытанням гісторыі Заходняй Беларусі. Менавіта таму дысертацыя К. Д. Ананькі ў гэтым плане можа закрыць чарговую “белую пляму” ў айчыннай гістарыяграфіі.

Дысертацыйнае даследаванне К. Д. Ананькі з’яўляецца самастойнай працай, якая была падрыхтавана на падставе шырокага кола дакументальных крыніц з архіваў і музеяў Беларусі, Польшчы і Літвы. Акрамя таго, у дысертацыі прадстаўлены аналіз гістарыяграфіі айчынных і замежных даследчыкаў, што дазваляе сфарміраваць цэласную карціну існавання беларускіх гімназій на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.).

Палажэнні, якія выносяцца на абарону, у поўнай ступені адпавядаюць пастаўленым задачам. Структура працы лагічна пабудавана. Усе главы і раздзелы даследавання звязаваны паміж сабой і раскрываюць важныя аспекты, якія вылучае саіскальнік. Асобна ўдакладняецца паняцце беларускіх гімназій – установы сярэдняй адукацыі, або сярэднія школы з беларускай мовай навучання на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, створаныя альбо рэарганізаваныя беларускімі актывістамі і арганізацыямі з мэтай пашырэння нацыянальнай ідэнтычнасці і развіцця адукацыйнага працэсу.

Асобнай увагі заслугоўвае распрацаваная саіскальнікам перыядызацыя існавання беларускіх гімназій. Яна ўключае чатыры этапы, кожны з якіх навукова абгрунтоўваецца і падкрэсліваецца фактамі. Пра грунтоўнасць даследавання сведчаць характарыстыка педагагічнага корпусу, выяўленне прычынна-следчых сувязяў у аналізе ўплыву грамадска-палітычных працэсаў у Заходняй Беларусі на ўнутранае жыццё беларускіх гімназій у міжваенны перыяд. Асобна раскрываецца праблема беларускіх гімназій як адных з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця міжваеннай Заходняй Беларусі.

Вынікі дысертацыі прадстаўлены ў 22 навуковых артыкулах, апублікаваных у выданнях Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі. Афармленне аўтарэферата адпавядае патрабаванням Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь. Лічу, што дысертацыя з’яўляецца важным укладам у сучасную айчынную гістарыяграфію, а яе аўтар – Кірыл Дзмітрыевіч Ананька – можа быць прадстаўлены да прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
дацэнт кафедры гуманітарных навук
Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага
ўніверсітэта С. У. Грыбава

Подпись(и) Грибовой С.В.
удостоверяю
Нач. отдела кадров
« » 20 г.
АДДЗЕЛ КАДРАЎ